# *ДА 65-ГОДДЗЯ*
# *УЛАДЗІМІРА ВАЛЯР'ЯНАВІЧА РУЛЯ*



**Дарагі Уладзімір Валяр'янавіч!**

**Ваша імя даўно і трывала займае сваё месца ў шэрагах Гродзеншчыны літаратурнай. Воранаўскі край можа ганарыцца Вамі – шчыра адданым сынам роднай зямлі, чалавекам працы і творчасці, энтузіястам-краязнаўцам, патрыятызм для якога – не толькі грамадзянская пазіцыя, а стан душы. Менавіта яна, беларуская зямля, яе народ, гісторыя і культура з'яўляюцца для Вас невычэрпнымі крыніцамі натхнення, а Ваша Слова сімвалічным мостам злучае ў сабе дзень учарашні і дзень будучы. Ваша паэзія, дзе заўсёды побач гумар і драма, пяшчота і запал, служыць пацвярджэннем тэзіса аб тым, што сапраўдны паэт заўсёды адштурхоўваецца ад сваіх народных вытокаў і традыцый; яго шлях гэта нястомны пошук. Прыміце нашы сардэчныя віншаванні з 65-годдзем. Ад усёй душы жадаем Вам моцнага здароўя і сямейнага дабрабыту; няхай ва ўсіх справах Вам спадарожнічае поспех, а жыццё прыносіць толькі радасць; няхай Ваша творчасць будзе максімальна запатрабавана сучаснікамі і нашчадкамі. СА СВЯТАМ!**

Калектыў
Гродзенскага абласнога аддзялення
Саюза пісьменнікаў Беларусі

*3 верасня 2018 года*